*Т.Р. БАГАРАДАВА*

## АСЭНСАВАННЕ ПРАБЛЕМЫ «ВАЙНА І ДЗЯЦІНСТВА»Ў АПОВЕСЦІ В. КАЗЬКО

Другая сусветная вайна была асаблівай, бо не мела сабе роўных ва ўсёй гісторыі чалавецтва. Яна стала адзінаборствам розных светапоглядаў, канцэпцый жыцця. Фашызм выступіў са сваёй філасофіяй адносін да чалавека. Яшчэ напрыканцы XIX стагоддзя ўзнікла тэорыя няроўнасці рас, якую выкарысталі германскія ідэолагі. Л. Плоткін адзначаў: «Містычны культ блакітнавокага…арыйца, што стаіць па той бок дабра і зла, узыходзіў да тэорыі Ніцшэ» [1, с. 7]. Даследчык акцэнтаваў увагу на прапагандзе знакамітым філосафам культу вайны. На самой справе фашызм узяў за аснову сваёй ідэалогіі сумесь розных тэорый і поглядаў, якія выкарыстаў на карысць асабістых ідэолагаў і выканаўцаў.

Пасля заканчэння вайны настала неабходнасць пераасэнсавання ролі чалавека непасрэдна ў ваенных падзеях, у сусветным працэсе. Самым распаўсюджаным пунктам погляду на вынікі вайны стаў наступны: «Вайна выступае як бяздушная і безаблічная гіганцкая машына па вынішчэнні чалавека» [1, с. 125]. Менавіта дадзенай акалічнасцю тлумачыцца гуманістычны пачатак пасляваеннай літаратуры, удумлівы аналіз антычалавечай прыроды вайны.

Адным са шматлікіх аспектаў адлюстравання ваеннай рэчаіснасці стаў яе паказ праз прызму ўспрымання маленькага чалавека. Праблема «вайна і дзяцінства» вывучалася і асэнсоўвалася крытыкай, у прыватнасці, у манаграфіях і артыкулах С. Андраюка, В. Бечыка, А. Адамовіча, Э. Гурэвіч, П. Дзюбайлы, В. Каваленкі, М. Тычыны, П. Васючэнкі.

Тэма ваеннага дзяцінства ў літаратуры набыла сваю завершанасць з прыходам пісьменнікаў, якія ўвайшлі ў вайну дзецьмі. П. Васючэнка канстатуе: «Літаратары – «дзеці вайны», далёкія ад адзначанай гераізацыі ваенных падзей, унеслі свой настрой, знайшлі свой ракурс бачання трагічных падзей. Пакаленне беларускіх празаікаў у асобах В. Адамчыка, В. Казько, І. Пташнікава, Б. Сачанкі, Я. Сіпакова, М. Стральцова, І. Чыгрынава вылучылася падабенствам жыццяпісаў, лёсаў, пошукам формаў мастацкага асваення матэрыялу, адназначнасцю антываеннага гучання твораў. У полі гэтага бачання – цэлы комплекс праблем эстэтычнага, маральнага, філасофскага характару» [2, с. 3 – 4].

Такім чынам, праблема ваеннага дзяцінства ў літаратуры з’яўляецца шматаспектнай. Перш за ўсё асэнсоўваецца сувязь двух несумяшчальных пачаткаў: вайна і дзяцінства. Другім аспектам выступае дзіцячае ўспрыманне падзей як спосаб асэнсавання быцця. Выбар дзіцяці ў якасці апавядальніка ці назіральніка падзей падкрэслівае, паводле вызначэння П. Васючэнкі, «пранікальны» характар паказу і пераасэнсавання ваеннага мінулага. Дзіцячаму ўспрыманню ўласцівы эйдэтызм – чыста вобразнае асваенне навакольнага асяроддзя. Да яго ў якасці замацавання дадаюцца яшчэ і элементы гульні.

У 1970 – пачатку 1980-х гадоў у беларускай літаратуры ўзнікае філасофскі аспект як структурная асаблівасць прозы (у тым ліку і прысвечанай ваенным падзеям). В. Локун піша: «…Звязаны ён галоўным чынам з творчасцю А. Адамовіча, В. Казько, В. Быкава» [3, с. 5]. Змяніліся прыярытэты ў разуменні розных філасофскіх, маральных і эстэтычных катэгорый: дабро і зло, жыццё і смерць, свабода і несвабода, драматычнае і рамантычнае, трагічнае і гераічнае.

У традыцыях псіхалагічнага і гуманістычнага пачаткаў пры абмалёўцы чалавека ў творах Чорнага працягваецца творчасць В. Казько. У аўтара назіраецца тэндэнцыя да шырокай чалавечай змястоўнасці: «Герой…таксама ўбірае ў сябе вопыт сваіх суайчыннікаў і шырэй – усяго чалавецтва» [4, с. 39]. Герой пісьменніка – асоба, у якой жывуць два «я», якая знаходзіцца ў стане душэўнага крызісу. «Нельга не верыць…, што ён укладвае ў свае творы зусім матэрыяльны боль, кроў, слёзы…» [5, с. 277].

У многім тэндэнцыі мастацкага асваення рэчаіснасці бяруць пачатак з біяграфіі самога В. Казько: існаванне ў дзіцячым доме, праца на Кузбасе, вучоба ў Кемераўскім горным індустрыяльным тэхнікуме, праца на шахце, у геолагаразведцы. У аповесці «Высакосны год» (1972) аўтар бярэ за аснову руху сюжэту некаторыя ўражанні сваёй маладосці. У выніку ўтвараецца фон, на якім адбываецца рэтраспектыўны пошук героем часу і сябе ў ім. Аднак нельга сцвярджаць, што аўтар і яго герой – тоесныя асобы, хоць аповесць варта лічыць аўтабіяграфічнай. У дадзеным творы назіраецца пэўная публіцыстычнасць маналогаў, што сведчыць пра некаторую надуманасць пры абмалёўцы падзей. Фінал твора паказвае на неадназначнасць душэўнага стану героя: вопыт ваеннага дзяцінства не вычарпаў сябе.

У «Аповесці пра беспрытульнае каханне» (1975) В. Казько адмаўляецца ад «я-формы» апісання. Галоўны герой, Андрэй Разорка, уцякае ад самога сябе. Падаплёкай кахання героя выступае пачуццё адзіноты. Каханне адначасова з’яўляецца і выйсцем з палону дум пра мінулае, аднак самае светлае пачуццё падаецца ілюзорным, недаўгавечным.

Андрэй Разорка страціў у час вайны бацькоў і застаўся круглым сіратой. Ён не можа знайсці ўнутранага заспакаення і ў мірны час. Яму цяжка ў пасляваенным свеце. Ён злы на свет і на людзей. Але паступова хлопчык пачынае адчуваць, што адзінае выратаванне для яго – не паддацца стыхійнаму прыцягненню да жорсткасці, стаць насуперак зломму лёсу, кінуць яму выклік дабрынёй.

Своеасаблівым падагульненнем вопыту «ваеннага дзяцінства» з’яўляецца аповесць «Суд у Слабадзе» (1978). Кампазіцыйны цэнтр аповесці – выбух памяці галоўнага героя Лецечкі, які правёў пэўны адрэзак часу ў «кіндэрхайме».

У аповесці людзі ідуць на суд над здраднікамі і карнікамі не таму, што яны цікавяцца справядлівасцю прысуду закона. Для іх вельмі важнае асабістае дачыненне, бо яно дае выйсце пачуццю болю. В. Каваленка зазначае: «Вобраз Лецечкі ў аповесці «Суд у Слабадзе» – адзін з самых глыбокіх вобразаў ва ўсёй савецкай прозе чалавека, які трагічна перажыў вайну» [6, с. 282]. В. Казько завастрае трагізм сітуацыі пры дапамозе невырашальнасці канфлікту. Лецечка сам не хоча жыць, бо моцны яго душэўны боль: «Больш крыўдна было іншае: не паспеў нарадзіцца, а ўжо нібыта пракляты кімсьці, за якія грахі? Не паспеў нарадзіцца, не паспеў нічога спазнаць пра сябе, а ўжо гавораць час паміраць…» [7, с. 28].

Так званае «падвойнае бачанне» адпавядае працэсу ўмоўнай вобразнасці: выкрыстанню міфа, казкі, сінкрэтызму ўспрымання рэчаіснасці. Побач з гэтым існуе ірацыянальнае быццё: чорны сабака ў «Аповесці пра беспрытульнае каханне», міф пра «апошняга немца» ў «Высакосным годзе»: «У В. Казько элемент гульні разам з іншымі праявамі дзіцячасці паддаецца эфекту адчужэння» [2, с. 53].

Паказ ваеннага мінулага ў «падвойным бачанні» з’яўляецца працягам літаратурных традыцый пры адлюстраванні чалавечага быцця: паводзін ў памежнай сітуацыі, смерці, ахвярнасці, пачуцця віны і інш. Такім чынам, рэчаіснасць уяўляецца як супастаўленне палярных паняццяў і сіл быцця: «…Ён і сам жыў у тых сорак трэцім і сорак чацвёртым, але не хацеў верыць і таму жыццю. Ён адмаўляўся, адракаўся ад яго. Імкненне спазнаць дарэшты тое жыццё і адмаўленне ад таго, што такое можа быць, адначасова жылі ў ім, але існавалі як бы асобна адно ад другога. З такой дваістасцю чалавек здольны глядзець толькі сон, здольны толькі ў сне так верыць і не верыць у яго прывідную, нерэальную рэальнасць» [7, с. 152].

Чалавечая душа з’яўляецца сродкам спасціжэння літаратуры. В. Казько шукае разгадку жыццёвых чалавечых драм: «Аднак не заўсёды гэты працэс азначаны ў самім тэксце. В. Казько яго агаліў, не пабаяўся падзяліцца з чытачом яго таямніцамі і яго часам неадольнымі цяжкасцямі» [8, с. 100].

Паказ асаблівасцей псіхалагічнага стану чалавека, напрыклад, двaістасць натуры Лецечкі («Суд у Слабадзе»), дасягаецца шляхам выкарыстання колеравага фону, найчасцей сіняга і чырвонага: «Жыць за кожную высмактаную ў яго гарачую чырвоную кроплю крыві. Жыць…» [7, с. 53].

Асаблівасць чалавечага характару перадаецца праз выкарыстанне ўнутраных дыялогаў: «– І там і там нуда мая, туга мая, душыць, ціснe, што не ведаю я нічога: адкуль прыйшоў і куды пайду» [7, с. 142].

У творах назіраецца вялікая колькасць маналогаў, у якіх асэнсоўваецца сутнасць жыцця: «Калі ўжо жыць апошнія дні, дык жыць так, каб усім чарцям моташна было, і да чаго ж добра, што ён дажыў да гэтага дня, не памёр…Трэба быць разам з усімі, моцным, дужым трэба быць…» [7, с. 42].

У аповесцях ужываецца надзвычай багатая сімволіка: значным дасягненнем пры абмалёўцы чалавечага быцця выступае выкарыстанне сімвалаў сонца і дарогі: «І вось Лецечка пільнуе сонца. Не хочацца яму паміраць, жудасна паміраць. Ведаць пра тое, што ён памрэ на ўсходзе сонца. Сонца ўзыдзе, а цябе ўжо няма, нідзе няма» [7, с. 8]; «Была, была ў яго такая дарога ў сакавіку сорак чацвёртага ці ў жніўні сорак трэцяга – гэтага ён не памятае. Для яго тады не існавала пары года. Час быў падзелены на святло і змрок. А дарога была адначасова ў святле і ў змроку…» [7, с. 120].

Для раскрыцця быційных пытанняў, адлюстравання ўнутранага стану чалавека, атаясамлівання яго ў акаляючым свеце выкарыстоўваецца прыём паказу пахаў, якія суправаджаюць чалавечае жыццё: пахаў прыроды, зямлі: «Ён ужо даўно ўмеў пазнаваць жыццё і жывое па пахах, па колеры, таму што…ён часта сядзеў вось тут, на ганку, і сустракаў раніцу…» [7, с. 13].

Такім чынам, сутнасць асобы фарміруецца пад уплывам агульначалавечых сувязей, якія дэтэрмінуюць паводзіны чалавека, а таксама пры дапамозе маральных якасцей, якія могуць змяняць гэты набыты пачатак. Дух свабоды як рухавік грамадскай і ўнутранай свядомасці выклікае феномен масавых рухаў. Героі В. Казько – людзі ўнутрана свабодныя, якія стаяць па-за часавымі межамі. Трагічнасць аповеду абумоўлена выкарыстаннем дзіцячай тэматыкі пры абмалёўцы ваеннай рэчаіснасці. Літаратура, якая служыла на карысць асобе, «імкнулася вырвацца са строга дэтэрмінаваных прасторава-часавых і іншых прадметна-лакальных вызначэнняў,…узняцца да ўсведамлення сутнасці праблем быцця свету і чалавека» [9, с. 7].

ЛІТАРАТУРА

1. Плоткин, Л. Литература и война: Великая Отечественная война в русской советской литературе / Л. Плоткин. – М.-Л.: Советский писатель, 1967. – 357 с.
2. Васючэнка, П. Пошукі страчанага дзяцінства: беларускія празаікі «сярэдняга пакалення» аб Вялікай Айчыннай вайне / П. Васючэнка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 80 с.
3. Локун, В.І. Маральна-філасофскія пошукі беларускай ваеннай і гістарычнай прозы: 1950–1960-я гг. / В.І. Локун. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 109 с.

4. Гурэвіч, Э. Пафас гераізму / Э. Гурэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1979. – 208 с.
5. Шупенька, Г. Прага мастацкасці / Г. Шупенька. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1996. – 461 с.
6. Коваленко, В.А. Общность судеб и сердец / В.А. Коваленко. – Минск: Наука и техника, 1985. – 351 с.
7. Казько, В. Судны дзень / В. Казько. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1998. – 478 с.
8. Егоренкова, Г. Звено связующее: литературно-критические статьи / Г. Егоренкова. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1990. – 255 с.
9. Гаранин, Л.Я. Философские искания в белорусской литературе / Л.Я. Гаранин. – Минк: Наука и техника, 1984. – 222 с.